


# Гродзенскі універсітэт

ГАЗЕТА ГРОДЗЕНСКАГА ДЗЯРЖАЎНАГА УНІВЕРСІТЭТА ІМЯ ЯНКІ КУПАЛЫ

Выдаецца з 1986 года ● № 9 (270). ● 3 лістапада 1999 года, серада

Выходзіць адзін раз на месяц ● Распаўсюджваецца бясплатна


## 17 лістапада — Міжнародны дзень студэнтаў

### СА СВЯТАМ!

Усіх студэнтаў і студэнтак віншуем з надыходзячым святам - Днём студэнтаў!

Жадаем Вам аптымізму і смаку да радасцяў жыцця, жадаем Вам пакінуць яркі след у родным універсітэце, а таксама - на будучыню - у навуцы, у жыцці.

Няхай непаўторнае студэнцкае жыццё будзе для Вас шчаслівым. Няхай у залікоўках будуць толькі выдатныя адзнакі, а бытавыя праблемы ніяк не ўплываюць на авалоданне ведамі і Вашы крокі ў навуцы.

ПРАФКАМ СТУДЭНТАЎ.

## ІМЯННЫЯ СТЫПЕНДЫІ

**ПРЭЗІДЭНЦКАЯ СТЫПЕНДЫЯ**

**К. КАРПІНСКІ** - студэнт 5 курса факультэта псіхалогіі і педагогікі (аддзяленне псіхалогіі).

**М. ПАБЯГАЙЛА** - студэнт 5 курса матэматычнага факультэта.

**ІМЯ ФРАНЦЫСКА СКАРЫНЫ**

**Д. МАКСІМЕНКА** - студэнт 3 курса фізіка-тэхнічнага факультэта.

**М. ЗАРЭЦКАЯ** - студэнтка 5 курса факультэта гісторыі і культуры.

**ІМЯ ЯНКІ КУПАЛЫ**

**С. ІВАНОЎ** - студэнт 5 курса факультэта псіхалогіі і педагогікі (аддзяленне псіхалогіі).

**ІМЯ ЯКУБА КОЛАСА**

**А. КАРПУК** - студэнтка 5 курса філалагічнага факультэта (аддзяленне беларускай і славянскай філалогіі).

**ІМЯ МАКСІМА БАГДАНОВІЧА**

**А. АНЦІПІН** - студэнт 5 курса факультэта эканомікі і кіравання.

**ІМЯ ЯФІМА КАРСКАГА**

**А. ФЯДУЛАВА** - студэнтка 5 курса юрыдычнага факультэта.

**ІМЯ ПЕТРУСЯ БРОЎКІ**

**А. ПРАНЕВІЧ** - студэнт 4 курса матэматычнага факультэта.

**ІМЯ КАНДРАТА КРАПІВЫ**

**Г. КЛІМ** - студэнтка 4 курса факультэта псіхалогіі і педагогікі.

**ІМЯ А.С. ПУШКІНА**

**В. КУРГАНСКАЯ** - студэнтка 5 курса філалагічнага факультэта (аддзяленне рускай і класічнай філалогіі).

**СТЫПЕНДЫІ САВЕТА УНІВЕРСІТЭТА**

**Д. КУЧЫНСКІ** - студэнт 4 курса факультэта эканомікі і кіравання.

**В. БАСТАВА** - студэнтка 4 курса факультэта псіхалогіі і педагогікі (аддзяленне мастацтваў).

**А. АЛЯКСЕЙЧЫК** - студэнтка 5 курса факультэта біялогіі і экалогіі.

**І.ПЯСОЦКАЯ** - студэнтка 5 курса філалагічнага факультэта.

**І.ЦІХАН** - студэнтка 5 курса філалагічнага факультэта (аддзяленне рамана-германскай філалогіі).

**С. АРХІПАВА** - студэнтка 5 курса філалагічнага факультэта (аддзяленне рускай і класічнай філалогіі).

**Я. ДЫМАВА** - студэнтка 5 курса філалагічнага факультэта (аддзяленне рускай і класічнай філалогіі).

**Ю.АМЕЛЬЧАНКА** - студэнтка 5 курса факультэта псіхалогіі і педагогікі (аддзяленне мастацтваў).

**СТЫПЕНДЫІ ІНФАБАНКА**

**П. КАРТАЎЦАЎ** - студэнт 3 курса матэматычнага факультэта.

**Н. ДЗЕЕВА** - студэнтка 4 курса матэматычнага факультэта.

**Р.СІНЕВІЧ** - студэнт 5 курса факультэта эканомікі і кіравання.

**А. ТРЫАР** - студэнтка 5 курса факультэта эканомікі і кіравання.

**Ю. ДЗЯРГАЎКА** - студэнт 4 курса фізіка-тэхнічнага факультэта.

**С. ЗЛОЦКІ** - студэнт 4 курса фізіка-тэхнічнага факультэта.

## З КАГОРТЫ ВЫДАТНІКАЎ



**Сяргей Злоцкі - выпускнік фізіка-матэматычнага класа школы-гімназіі № 30. Скончыў школу з залатым медалём, выйшаў пераможцам абласной алімпіяды, а таму і паступіў на фізіка-тэхнічны факультэт даволі лёгка. Вучыцца выдатна. Карыстаецца аўтарытэтам сярод студэнтаў-аднакурснікаў. За сур'ёзныя адносіны да вучобы паважаюць яго і выкладчыкі.**

**Па выніках летняй экзаменацыйнай сесіі Сяргей прадстаўлены да імяннай стыпендыі Інфабанка.**

**НА ЗДЫМКУ: студэнт 4 курса фізіка-тэхнічнага факультэта Сяргей ЗЛОЦКІ.**

## КАЛІ ВЯРСТАЎСЯ НУМАР

**28 кастрычніка прайшла канферэнцыя працоўнага калектыву універсітэта па абмеркаванні праекта Дагавору аб стварэнні Саюзнай дзяржавы. Былі выказаны думкі па пытаннях збліжэння народаў Беларусі і Расіі.**

## ВІНШАВАЛЬНАЯ ПАШТОЎКА

**Нагадваем, калі і каго можна павіншаваць з юбілеем.**

✻ 1 лістапада - **Веру Аляксандраўну ГОРСКУЮ** - кіраўніка вытворчай практыкі навучальнага аддзела.

✻ 4 лістапада - **Ганну Серафімаўну СІДАРЧУК** - загадчыцу кафедры матэматыкі і методыкі выкладання матэматыкі ў пачатковай школе.

✻ 8 лістапада - **Мечыслава Канстанцінавіча ЛЕВАНДОЎСКАГА** - інжынера АГС.

✻ 10 лістапада - **Яна Аляксандравіча МІКШУ** - дворніка інтэрната №3.

✻ 20 лістапада - **Эдварда Францавіча БАШКО** - лабаранта кафедры фізвыхавання.

✻ 23 лістапада - **Васіля Аляксандравіча СТРУКА** - загадчыка кафедры матэрыялазнаўства і рэсурсазберагальных тэхналогій.

## ЦИТАТА НОМЕРА:

**«Единственный путь, ведущий к знанию, - это деятельность».**

**Б. ШОУ.**

# ГРОДЗЕНСКАМУ ДЗЯРЖАЎНАМУ УНІВЕРСІТЭТУ ІМЯ ЯНКІ КУПАЛЫ - 60 ГАДОЎ

## ПОЗДРАВЛЯЕМ

**выпускников магистратуры с успешным окончанием и защитой магистерской диссертации и присвоением степени магистра:**

А.А. Ярошевича, В.Н. Хильманович, О.В. Борушко, Н.Т. Авласевич, В.И. Шота, А.Д. Короля, А.И. Грицевича, С.Ю. Куклу, Т.И. Караченцеву, И.А. Корлюкову, В.Л. Радюна, В.С. Скращука, Е.А. Тимашову, И.Л. Кирилкину, А.А. Забродскую, Н.М. Богатко, О.Л. Слижевского, Ю.С. Цецервова, Н.Г. Бесько, А.Н. Терменева, Ю.Э. Барановского, Г.Г. Нарушевич, Е.С. Данилюк, А.М. Полещука, Д.И. Задаля, Ю.В. Жгутову, Н.А. Кастусик, М.А. Крюк, Е.В. Стельмах, В.В. Анисимову, А.А. Габинскую, О.М. Жеренкову, О.В. Столярчук, Г.И. Якубель, И.Н. Гончар.

**НА КОНКУРС**

## ГІМН УНІВЕРСІТЭТА

Дзе імчацца праз стагоддзі
Нёманскія хвалі,
Нас навука і Купала
Разам паядналі.
І пакуль ліецца Нёман,
Будзь паўсюдна слаўны,
Храм навукі, альма матэр -
Гродзенскі дзяржаўны.

Каб мужоў вучоных ў свеце
Не знікала племя
І каб парасткі давала
Скрозь навукі семя,
Дзверы нам свае штодзённа
Адчыняе слаўны
Храм навукі, альма матэр -
Гродзенскі дзяржаўны.

І выкладчыкам, каторым
Праца іх ў ахвоту,
І студэнтам — пераможцам
Уласнае ляноты —
Слава ўсім — праз іхні клопат
Ты сягоння слаўны,
Храм навукі, альма матэр -
Гродзенскі дзяржаўны.

**Аляксей МАЦЭВІЛА, выкладчык-стажор кафедры рускай і замежнай літаратуры.**



*Л.У. Кірылюк нарадзілася 25 верасня 1926 года ў Гродне. З 1944 па 1947 г. працавала бухгалтарам у ІУН. Закончыла фізіка-матэматычны факультэт Гродзенскага педінстытута (1949-1952 г.). У 1952-1955 г. працавала настаўнікам матэматыкі сярэдняй школы №3 г. Гродна. З 1955 года працуе ў Гродзенскім педагагічным інстытуце выкладчыкам (1955-1962 г.), старшым выкладчыкам (1962-1969 г.), дацэнтам (1969-1990 г.), прафесарам (1990 г. па цяперашні час). Прарэктар па вучэбнай рабоце педінстытута (1971-1977 г.), універсітэта (1978-1980 г.). Загадчык кафедры геаметрыі і методыкі выкладання матэматыкі (1980-1982 г.), дэкан матэматычнага факультэта (1981-1991 г.). Выдатнік народнай асветы БССР (1976 г.), дэпутат Гродзенскага абласнога савета (1957-1959 г.), Гродзенскага гарадскога савета (1959-1973 г.). Узнагароджана медалём "Ветэран працы" (1985 г.), медалём "За доблесную працу. Да 100-годдзя з дня нараджэння У.І. Леніна", Ганаровай граматай ВС БССР (1981 г.). Кандыдат педагагічных навук (1969 г.), прафесар (1991 г.).*



ПОСТАЦІ ВНУ

## ПРАФЕСАР ЛІДЗІЯ КІРЫЛЮК

**- Лідзія Уладзіміраўна, чым Вам запомнілася дзяцінства?**

- Маё дзяцінства прайшло ў Гродне. Бацька працаваў у майстэрні, якая займалася афарбоўкай скур, належала, як сказалі б цяпер, прыватнаму прадпрымальніку. У 1933 годзе я паступіла вучыцца ў першы клас польскай школы, якая, дарэчы, размяшчалася ў старым корпусе універсітэта. Пасля вайны, у 1948 годзе, скончыла з адзнакай школу рабочай моладзі. У перыяд акупацыі працавала рабочай у красільнай майстэрні разам з бацькам. Таму ў дзяцінстве і юнацтве добра запомніўся пах фарбаў, якімі апрацоўвалі скуры.

**- Раскажыце, калі ласка, аб вашых студэнцкіх гадах.**

- У педінстытут мяне як выдатніцу школы прынялі без экзаменаў. Я ўжо была замужняя студэнтка, у 1947 годзе мы з мужам Рыгорам адгулялі вяселле. У перыяд вучобы ў 1950 годзе нарадзіўся сын Саша. Рэктарам у той час быў М.В. Уласавец, дэканам матэматычнага факультэта - В.І. Даўнаровіч. Выкладчыкамі працавалі К.А. Акімава, Г.А.Марціросаў - вельмі добрыя людзі. У корпусе былі добра нагрэтыя печы, для якіх студэнты і выкладчыкі нарыхтоўвалі дровы. Набор на першы курс быў 50 чалавек. Аднак выпускнікамі сталі толькі 24 студэнты. Многія адсейваліся з-за недастатковай базавай падрыхтоўкі. Выкладчыкі Я.І. Рыўкінд, М.Д. Бяспамятных і іншыя былі вельмі патрабавальныя.

**- Ці было ў педінстытуце, як кажуць, нефармальнае жыццё?**

- Так, было. Была арганізавана выдатная самадзейнасць. Праводзіліся сходы, вечарыны. На іх выкладчыкі і многія студэнты прыходзілі сем'ямі. Запомнілася тая акалічнасць, што першы танец на вечарыне рэктар М.В. Уласавец заўсёды танцаваў з жонкай і такім чынам адкрываў вечарыну. Танцавалі бальныя танцы - кракавяк, падэспань, польку.

**- У 1949 годзе на вокладцы часопіса "Огонек" быў Ваш фотаздымак. З чым гэта было звязана?**

- У 1949 годзе ўся Беларусь адзначыла 10-годдзе аб'яднання ўсходняй і заходняй тэрыторый. У Гродна прыехаў карэспандэнт "Огонька". Адным са здымкаў, які ён зрабіў, быў здымак трох лепшых студэнтак педінстытута на фоне вну, які сімвалізаваў дасягненні ў галіне культуры на Заходняй Беларусі. Відаць, рэдактару ўсесаюзнага часопіса здымак спадабаўся.

*"Лідзія Уладзіміраўна Кірылюк - выдатны метадыст. Вызначаецца прынцыповасцю ў вырашэнні пытанняў, акуратнасцю ў выкананні даручэнняў. Адносіцца да выкладчыкаў з абсалютна бясспрэчнай у маральных адносінах рэпутацыяй. Яе вялікая заслуга - стварэнне шэрагу вучэбных фільмаў па матэматыцы. Чалавек вялікай ініцыятывы, заўсёды ўводзіць штосьці новае ў сваю работу".*

**(З выступлення дацэнта М.Д. Бяспамятных пры абранні Л.У. Кірылюк па конкурсу).**

**- Як у калектыве даведаліся аб тым, што педінстытут будзе пераўтвораны ва універсітэт?**

- Размовы пра гэта ішлі пры рэктары Д.С. Маркоўскім. Гаварылі, што ў Маскве былі супраць адкрыцця універсітэта ў Гродне. Апошнюю кропку паставіў А.М. Касыгін, які адобрыў ініцыятыву рэспублікі і вобласці. Відаць, адыграла ролю і тое, што ў Беларусі гэта была толькі трэцяя вну такога тыпу, а ў Заходняй Беларусі - першая. У калектыве вестку аб адкрыцці універсітэта ўспрынялі па-рознаму, палярна: ад выражэння радасці да скептыцызму. Універсітэт ствараўся не на голым месцы, а на базе педінстытута, які меў вялікі вопыт у навучальна-метадычнай працы. На базе педінстытута ў 1970-1978 г. праходзіла шмат усесаюзных нарад кіраўнікоў вну, загадчыкаў кафедр. Навучальная ўстанова мела выдатныя метадычныя кабінеты, нават кабінет акцёрска-рэжысёрскай падрыхтоўкі настаўніка.

**- Было, відаць, цяжка ў першыя гады?**

- Так, пераход на новыя навучальныя планы, праграмы, наогул, на новы змест навучання патрабаваў шмат намаганняў. Трэба было падняць узровень навуковай і навучальна-метадычнай працы. Але найбольш цяжкім выпрабаваннем была перабудова свядомасці выкладчыкаў. Так, напрыклад, трэба было ўсвядоміць паняцце і змест невядомых для нас спецыялізацый. Першамайская дэманстрацыя ў 1978 годзе яшчэ прайшла з эмблемай педінстытута. Афіцыйныя мерапрыемствы па адкрыцці універсітэта былі арганізаваны ў сярэдзіне кастрычніка.

**- Які перыяд Вам найбольш памятны?**

- Перыяд працы дэканам. Многа намаганняў прыходзілася аддаваць арганізацыі працы студэнтаў. Была наладжана вучэбная дысцыпліна, пазааўдыторная праца, самадзейнасць. Значна павысіўся ўзровень навуковай працы на матэматычным факультэце.

*"Л.У. Кірылюк адна з першых стала прымяняць тэхнічныя сродкі навучання. З'яўляецца аўтарам шэрагу сцэнарыяў матэматычных фільмаў, якія былі зняты пад яе кіраўніцтвам. Вядучы выкладчык у галіне матэматыкі і методыкі яе выкладання. Валодае шырокай эрудыцыяй. Вызначаецца тактам, сардэчнай дабрынёй у зносінах са студэнтамі і выкладчыкамі".*

**(З характарыстыкі Л.У. Кірылюк).**

**- Як Вам удаецца арганізаваць самастойную працу студэнтаў?**

- Усё жыццё я бачыла перад сабой не студэнцкую масу, а асобных студэнтаў з іх індывідуальнымі асаблівасцямі. Шырока прымяняю ТСН, відэатэхніку. Стараюся наладзіць самастойную працу студэнтаў, шмат працую з непаспяваючымі студэнтамі. Я люблю сваю работу і студэнтаў, і яны адпаведна адносяцца да мяне.

**- Вашы пажаданні сённяшнім студэнтам.**

- У сваёй большасці на вучобу прыходзяць студэнты, якімі мы можам ганарыцца. Жадаю ім дасягнуць вяршыняў у засваенні прафесіі, шчасця ў асабістым жыцці.

**Матэрыял падрыхтаваў прафесар В.П. ТАРАНЦЕЙ.**

## ДА 75-ГОДДЗЯ З ДНЯ НАРАДЖЭННЯ ПРАФЕСАРА І.Я.ЛЕПЕШАВА

# ШЧОДРАСЦЬ ТАЛЕНТУ

Я вельмі ганаруся тым, што мне пашчасціла быць вучаніцай Вялікага настаўніка - Івана Якаўлевіча Лепешава. Яго высокі ўзровень культуры, велізарная працаздольнасць, творчы пошук, шырокая эрудыцыя, тонкае адчуванне душы чалавека, сціпласць заўсёды ўражвалі і ўражваюць усіх, хто працуе разам з ім. Пастаянную прысутнасць, увагу, тактоўнасць, добразычлівасць з боку Івана Якаўлевіча адчуваюць не толькі яго калегі па працы, аспіранты, але і студэнты. Ён робіць усё магчымае для самарэалізацыі студэнтаў, маладых выкладчыкаў, садзейнічае іх прафесійнаму росту.

Яшчэ ў студэнцкія гады мы ўсе захапляліся яго незвычайнай эрудыцыяй, начытанасцю, справядлівасцю. Для нас ён быў кумірам вучонасці, багацця ведаў. Падкупляў і яго па-народнаму дасціпны гумар у час заняткаў. Іван Якаўлевіч заўсёды бачыць у студэнце перш за ўсё чалавека, і адпаведна студэнты адносяцца да яго з вялікай павагай, любоўю, разуменнем.

Больш за ўсіх пашанцавала мне. Я пісала курсавую, а затым кандыдацкую пад кіраўніцтвам Івана Якаўлевіча. Назаўсёды ў памяці застанецца яго бацькоўская апека. Памятаю, як ён мяне, яшчэ ўчарашнюю студэнтку, сарамлівую, нясмелую, узяў разам з сабой у Мінск у камандзіроўку. Паказаў, дзе размешчаны бібліятэкі, як працаваць з картатэкай, завёў у Інстытут мовазнаўства, пазнаёміў з вялікімі вучонымі. Пры напісанні работы Іван Якаўлевіч не проста даваў настаўленні, а іменна вучыў працаваць. Не заўсёды ўсё атрымлівалася, былі і хвіліны роспачы, але падказкі, заўвагі былі настолькі слушныя, выказваліся ў такой тактоўнай манеры, што падстаў для крыўды не ўзнікала, і хацелася ізноў працаваць.

Пасля атрымання дыплома аб навуковай ступені Іван Якаўлевіч не застаўся безуважлівым да маіх навуковых спраў. Заўсёды шчодра дзеліцца сваімі ідэямі, падказвае тэмы. Рашаючы кожны дзень шмат праблем, застаецца чулым, уважлівым. Апантаны краязнаўца, патрабавальны і добры настаўнік, інтэлігентны, але разам з тым энергічны і дзейсны. Вось такім мы бачым Івана Якаўлевіча штодзённа. Гэта сапраўды адданы сваёй справе Чалавек, Педагог. Разам з тым Іван Якаўлевіч - Творца навукі. Яго навуковыя паведамленні характарызуюцца актуальнасцю тэматыкі, прадуманасцю, грунтоўным веданнем матэрыялу, аргументаванасцю палажэнняў і вывадаў.

Іван Якаўлевіч - верны сын беларускай зямлі, яе неад'емная часцінка. Яго працяг у яго шматлікіх навуковых працах і ідэях.

Вядома, дасягнутае - не мяжа. Іван Якаўлевіч на крылах сваіх мар і задум імчыць далей. Шчаслівага Вам палёту, наш дарагі Вялікі настаўнік.

**М. ЯКАЛЦЭВІЧ,**
**дацэнт кафедры беларускай мовы.**

## *У ПРАФСАЮЗНЫХ КАМІТЭТАХ*

# АБРАНЫ НОВЫ СКЛАД ПРАФКАМА

Адбылася прафсаюзная канферэнцыя працоўнага калектыву універсітэта. На парадку дня яе былі справаздача старшыні прафкама выкладчыкаў і супрацоўнікаў за апошнія пяць гадоў, справаздача аб рабоце рэвізійнай камісіі, выбары новага складу прафкама, выбары рэвізійнай камісіі, выбары дэлегатаў на XXII абласную канферэнцыю работнікаў адукацыі і навукі, дэлегіраванне прадстаўнікоў прафсаюзнай арганізацыі ў склад абкама прафсаюза.

З прывітальным словам звярнуўся да прысутных рэктар універсітэта С.А. Маскевіч. Ён таксама павіншаваў юбіляра Ф.Б. Марголіна.

З дакладам па першым пытанні выступіў старшыня прафкама прафсаюза выкладчыкаў і супрацоўнікаў універсітэта Ул. А. Хілюта. Ён расказаў, што зроблена прафкамам у справе абароны правоў і інтарэсаў работнікаў у сацыяльнай сферы.

- Сёння аб сацыяльнай абароне гаварыць складана, - сказаў ён. - Эканамічная сітуацыя, недастатковае фінансаванне ў галіне адукацыі - гэта рэаліі дня, ад якіх нікуды не дзенешся. На жаль, сярэдні ўзровень зарплаты па стане на студзень бягучага года складаў усяго 56 працэнтаў ад заробтнай платы работнікаў прамысловасці. Жыццёвы ўзровень работнікаў бюджэтнай сферы знізіўся ўтрая. Ацэньваючы вынікі, нам трэба заставацца ў рэальным часе. Мэтай работы прафкам ставіў стварэнне добрага маральна-псіхалагічнага клімату ў калектыве, стабільнасці, наладжванне супрацоўніцтва з адміністрацыяй. Нягледзячы на складанасць сітуацыі, мы не дапусцілі расколу прафсаюзнай арганізацыі.

Далей старшыня прафкама спыніўся на канкрэтных справах, на тых ключавых момантах у рабоце прафсаюзнага камітэта, якія дазваляюць кожнаму канкрэтнаму работніку дапамагчы.

Што гэта за справы? Гэта - і жыллёвая праграма, якая паступова рэалізуецца ў жыццё, і пуцёўкі для аздараўлення супрацоўнікаў і іх дзяцей, і матэрыяльнае стымуляванне, і забеспячэнне некаторымі прадуктамі харчавання.

З дакладам аб рабоце рэвізійнай камісіі выступіў яе старшыня Р.Ф. Курышка.

Затым пачалося абмеркаванне дакладу, якое прайшло актыўна і зацікаўлена. Абраны новы склад прафкама і дэлегаты на XXII абласную канферэнцыю прафсаюзаў работнікаў адукацыі і навукі.

**Финансирование социальных мероприятий администрацией университета**

| Показатели | 1995 г., млн.р. | 1996 г., млн.р. | 1997 г., млн.р. | 1998 г., млн.р. | 1999 г., млн.р. |
|---|---|---|---|---|---|
| 1. Всего перечислено профкому | 107 | 95 | 200 | 526.5 | 925 |
| 1.1. На оздоровление | 100 | 80 | 175 | 345 | 925 |
| 1.2. Новогодние подарки | 7 | 15 | 25 | 100 | - |
| 2. Помощь ветеранам | 1.5 | 19 | 65 | 150 | 529 |
| 3. Выплачено матер. помощи, в том числе: | 81.3 | 212.3 | 1.597 | 3.329 | 7.213 |
| 3.1. по бюджету | 61.3 | 134.1 | 1.276,6 | 1.880 | 3.288,5 |
| 3.2. по внебюджету | 29.4 | 76.9 | 314 | 1.420 | 3.790,2 |
| 3.3. по НИСу | 0.6 | 1.3 | 6.4 | 28 | 134.3 |
| 4. Выплачено премий, в том числе: | 1207.6 | 1889.7 | 3.866,7 | 7.488,2 | 23.834,4 |
| 4.1. по бюджету | 629.3 | 941.2 | 1.617 | 2.706 | 5.7142 |
| 4.2. по внебюджету | 453.5 | 875 | 2.135 | 4.206,5 | 17.136,6 |
| 4.3. по НИСу | 24.7 | 73.5 | 114.7 | 573.7 | 983.5 |
| 5. Жилищная программа | - | - | 2.730,5 | 1.760,2 | 5.146 |
| 6. На заготовку овощей | - | - | - | 600 | 1260.1 |

# У КАНТАКЦЕ З АДМІНІСТРАЦЫЯЙ

Адбылася прафсаюзная канферэнцыя прафкама студэнтаў. З інфармацыяй аб рабоце, праведзенай прафкамам па сацыяльнай абароне студэнтаў, выступіў старшыня камітэта прафсаюза студэнтаў А.Грынь.

- Студэнцкі прафкам, - сказаў дакладчык, - працуе ў цесным кантакце з адміністрацыяй універсітэта. Сумесна мы размяркоўваем месцы ў інтэрнатах, прымаем рашэнні аб працягласці тэрмінаў пражывання, з удзелам прафкама аказваецца матэрыяльная дапамога студэнтам-сіротам, інвалідам, малазабяспечаным, студэнцкім сем'ям, накіроўваюцца студэнты на санаторна-курортнае лячэнне, у дамы адпачынку, прафілакторый, аздараўленчыя спартыўныя лагеры і г.д. Толькі з сваіх сродкаў выплачана студэнтам 131,3 млн. рублёў матэрыяльнай дапамогі, каля 37,2 млн. рублёў выдзелены на правядзенне спартыўных мерапрыемстваў.

З інфармацыяй аб рабоце рэвізійнай камісіі студэнцкага прафкама выступіў яе старшыня І. Кергет.

Затым прайшло абмеркаванне дакладу і выбары новага складу прафкама. Аднагалосна старшынёй студэнцкага прафкама і зноў абраны А.А. Грынь.

# ЗДАБЫТКІ, ВЫНІКІ І ПЕРСПЕКТЫВЫ

## АБ ВЫНІКАХ ДЗЕЙНАСЦІ УНІВЕРСІТЭТА Ў 1998/99 НАВУЧАЛЬНЫМ ГОДЗЕ І ЗАДАЧАХ НА 1999/2000 ГОД

**Ужо стала традыцыяй на апошнім пасяджэнні Савета універсітэта штогод падводзіць вынікі за навучальны год і вызначаць асноўныя кірункі працы і задачы на наступны год.**

**Па просьбе чытачоў газеты публікуем у перакaзе асноўныя моманты справаздачнага даклада рэктара універсітэта С.А.Маскевіча, з якім ён выступаў на апошнім у мінулым навучальным годзе (чэрвеньскім) пасяджэнні Савета універсітэта.**

У 1998/99 годзе універсітэт у сваёй дзейнасці кіраваўся законамі РБ «Аб адукацыі ў Рэспубліцы Беларусь», «Аб навуковай дзейнасці», Статутам універсітэта, Палажэннем аб шматузроўневай сістэме. Прыкладным палажэннем аб вышэйшай навучальнай установе, Палажэннем аб мэтавай, кантрактнай падрыхтоўцы, Палажэннем аб парадку заключэння дагавораў на падрыхтоўку спецыялістаў і рабочых кадраў у навучальных установах РБ, Палажэннем аб курсавых экзаменах і заліках у вышэйшых навучальных установах, Інструкцыяй аб парадку пераводу, аднаўлення і адлічэння студэнтаў у вышэйшых навучальных установах РБ, Палажэннямі аб структурных падраздзяленнях і Саветах факультэта і вну, Палажэннем аб аспірантуры і Часовым палажэннем аб магістратуры, Палажэннем аб парадку стварэння ЧНК і інш. нарматыўна-прававымі актамі.

Акрамя вышэйназваных дакументаў, дзейнасць універсітэта рэгулявалася пастановамі Савета універсітэта, у якія было ўключана 206 пунктаў, загадамі рэктара, заданнямі, якія прадугледжаны ў зацверджаных Саветам універсітэта праграмах:

- маркетынгавая праграма;
- праграма гуманізацыі і гуманітарызацыі вышэйшай адукацыі;
- праграма ўкаранення інфармацыйных тэхналогій;
- праграма сацыяльнай падтрымкі супрацоўнікаў і студэнтаў універсітэта;
- праграма развіцця фізічнай культуры і спорту;
- праграма па ўдасканаленні прымянення тэхнічных сродкаў навучання ў навучальна-выхаваўчым працэсе.

Рэалізацыя прынятых праграм - галоўная задача будучага года.

### АСНОЎНЫЯ ВЫНІКІ РАБОТЫ УНІВЕРСІТЭТА

Адной з асноўных знешніх функцый, якую выконвае універсітэт, з'яўляецца падрыхтоўка кадраў. Менавіта гэта - асноўная задача універсітэта.

У 1998/99 навучальным годзе падрыхтоўка спецыялістаў вялася на ўсіх узроўнях: вышэйшая адукацыя, бакалаўрыят, магістратура, аспірантура, выдзелены грант для завяршэння доктарскай дысертацыі. Упершыню ў Беларусі ў 1999 годзе адбыўся выпуск спецыялістаў па спецыяльнасці «Класічная мова і антычная літаратура», спецыялізацыі «Руская мова як замежная», па спецыяльнасці «Руская мова і літаратура», спецыялізацыя «Рыторыка». Адбыліся першыя выпускі па спецыяльнасцях «Псіхалогія», «Эканамічная кібернетыка», «Англійская мова», «Нямецкая мова», «Французская мова», «Экалогія».

Адбыўся выпуск бакалаўраў па 2 спецыяльнасцях - (15 - англійская мова, 1 - французская мова), першы выпуск магістрантаў па 8 спецыяльнасцях, аспірантаў па 17 спецыяльнасцях.

Распачаў працаваць Інстытут павышэння кваліфікацыі і перападрыхтоўкі кадраў пры універсітэце.

Патрэбна адзначыць, што структура спецыяльнасцяў і спецыялізацый у параўнанні з 1997/98 годам значна не памянялася.

Так, у гэтым годзе падрыхтоўка спецыялістаў з вышэйшай адукацыяй вялася па 33 спецыяльнасцях, у тым ліку па профілях: навуковы -8, 20 спецыялізацый, гуманітарны - 10, 28 спецыялізацый, педагагічны - 9, 4 спецыялізацыі, тэхнічны - 3, 4 спецыялізацыі, эканамічны - 3, 2 спецыялізацыі.

Значная ўвага надавалася паляпшэнню якасці падрыхтоўкі спецыялістаў. Так, у мінулым навучальным годзе было выдадзена 10,3% дыпломаў з адзнакай, у гэтым годзе - 11,7% (на аддзяленні рускай і класічнай філалогіі - 38% дыпломаў з адзнакай).

Што тычыцца магістратуры, то штогод колькасць спецыяльнасцей павялічваецца. Так, у 1997/98 г. - 9, 1998/99 - 16, але набор у гэтым годзе адбыўся толькі па 13 спецыяльнасцях. Колькасць спецыяльнасцей у аспірантуры ў параўнанні з былым годам не змянілася (34). Разам з гэтым набор 1998/99 года адбыўся па 22 спецыяльнасцях (1997/98 па - 21 спецыяльнасці). Пры гэтым трэба адзначыць павышэнне эфектыўнасці працы аспірантуры, што выявілася ў трох датэрміновых абаронах кандыдацкіх дысертацый.

З бягучага года ажыццяўляецца прыём на новую спецыяльнасць «Бухгалтарскі ўлік, аналіз і аўдыт», а таксама падрыхтоўка ў межах 3 новых спецыялізацый. У магістратуры атрыманы дазвол Міністэрства адукацыі на падрыхтоўку спецыялістаў па 5 новых спецыяльнасцях, у аспірантуры набор плануецца па 25 спецыяльнасцях. У наступным годзе неабходна працягваць работу па ўдасканаленні структуры спецыяльнасцей і спецыялізацый (пед. профіль, эканамічны і тэхнічны).

Адным з важнейшых выніковых паказчыкаў дзейнасці навучальнай установы з'яўляецца размеркаванне спецыялістаў. Трэба зазначыць, што з году ў год усё большая колькасць нашых выпускнікоў атрымлівае накіраванне на працу.

| Вышэйшая адукацыя | | |
|---|---|---|
| | 1997/98 | 1998/99 |
| Выпуск | бюджэт -1077 | 1015 |
| | платнае - 522 | 296 |
| Размеркавана | бюджэт -546 | 677 |
| | платнае - 55 | 11 |
| Вольнае працаўладкаванне | бюджэт - 108 | 37 |
| | платнае - 224 | 49 |
| **Магістратура** | | |
| Выпуск | 7 (стац.) | 22 (стац.) |
| Размеркавана | не праводзідася | 17 |
| Вольнае працаўладкаванне | 14 | 5 |
| **Аспірантура** | | |
| Выпуск | 14 (стац.) | 24 |
| Размеркавана | 11 | 22 |
| Вольнае працаўладкаванне | 3 | 2 |

### НАВУКОВАЯ ДЗЕЙНАСЦЬ

За бягучы навучальны год дзейнасць універсітэта ў галіне навукі была накіравана на вырашэнне наступных асноўных задач:

1. Распрацоўку канцэптуальных падыходаў да развіцця навуковай дзейнасці.

2. Павышэнне эфектыўнасці падрыхтоўкі кадраў вышэйшай кваліфікацыі, студэнцкай навукі.

3. Павышэнне статуса навуковых калектываў і прызнанне ўзроўню даследаванняў універсітэта на ўзроўні рэспублікі.

У ходзе рэалізацыі пастаўленых задач было абаронена 4 доктарскія (1997/98 - 2), 18 кандыдацкіх дысертацый (1997/98 - 9). На рэспубліканскім конкурсе навуковых работ студэнтаў атрымана 26 дыпломаў, 4 гранты фонду фундаментальных даследаванняў, 2 стыпендыі Прэзідэнта РБ для студэнтаў і адна - для маладых дактароў навук.

Упершыню ў рэспубліцы сярод рэгіянальных вну універсітэт стаў галоўнай арганізацыяй па міжвузаўскай праграме «Дынамічныя сістэмы» і комплекснаму праекту «Моладзь як суб'ект і аб'ект сацыяльна-палітычнай трансфармацыі грамадства». Распрацавана і зацверджана канцэпцыя развіцця навукі ва універсітэце на перыяд да 2005 г. Пачаў выдавацца «Веснік універсітэта».

Параўноўваючы вынікі навуковай дзейнасці універсітэта з іншымі класічнымі універсітэтамі РБ, трэба зазначыць, што яны ў 1998 годзе былі прыкладна аднолькавыя.

Універсітэт удзельнічае ў пяці міжнародных праектах, у тым ліку ў двух адукацыйных. Гэта - «Стварэнне бізнес-магістратуры пры універсітэце» - Праект фонда Еўразія і «Дыстанцыйнае навучанне па кіраванні транспартам і лагістыкай» - Праект трансгранічнага супрацоўніцтва Tacis/Phare. Галоўнае ў наступным годзе - распачаць рэалізацыю навукова-тэхнічных рэгіянальных праграм.

### КУЛЬТУРНА-МАСАВАЯ РАБОТА

У мінулым навучальным годзе больш змястоўным і цікавым стаў адпачынак студэнтаў. Гэтаму садзейнічала добрая падрыхтоўка і арганізацыя большасці факультэцкіх і агульнауніверсітэцкіх мерапрыемстваў, асабліва тых, якія ўжо сталі традыцыйнымі. Выклікалі вялікую цікавасць і адзначаліся масавым характарам святы прызначэння першакурснікаў у студэнты на рамана-германскім аддзяленні філалагічнага факультэта, факультэтах эканомікі і кіравання і гісторыі і культуры, дні матфака, філфака, фізіка-тэхнічнага факультэта. У рамках дзён фізіка-тэхнічнага факультэта прайшла ўжо сёмая рэспубліканская навуковая канферэнцыя студэнтаў і аспірантаў па фізіцы кандэнсаваных асяроддзяў. Пры поўных залах гледачоў і балельшчыкаў праходзілі універсітэцкі конкурс першакурснікаў «Альма-матэр: любоў з першага погляду» (пераможца - каманда факультэта эканомікі і кіравання) і гульні клуба вясёлых і знаходлівых, у якіх лепш за ўсіх выступілі каманды філалагічнага факультэта і факультэта гісторыі і культуры.

*(Працяг на 5 стар.).*

# ЗДАБЫТКІ, ВЫНІКІ І ПЕРСПЕКТЫВЫ

## АБ ВЫНІКАХ ДЗЕЙНАСЦІ УНІВЕРСІТЭТА Ў 1998/99 НАВУЧАЛЬНЫМ ГОДЗЕ І ЗАДАЧАХ НА 1999/2000 ГОД

*(Працяг. Пач. на 5 стар.).*

Але перш за ўсё трэба адзначыць удалае выступленне ў мінулым сезоне універсітэцкай каманды «Янкі», якая ўвайшла ў эліту беларускай вышэйшай лігі КВЗ і ў верасні 1999 г. будзе выступаць у поўфінале, змагаючыся за перамогу.

Як заўсёды ў апошнія гады, творча і плённа працавалі аркестр народных інструментаў, тэатр моды, ансамбль «Капрыз», студэнцкі тэатр эстрадных мініятур. Канцэрты, у якіх яны бралі ўдзел, праходзілі з вялікім поспехам, а іх выступленні глядзеліся на адным дыханні. Прыкладам таму служаць навагодні канцэрт ва універсітэце, канцэрты пры ўручэнні сцяга пераможцы ў спаборніцтве Ленінскаму раёну г. Гродна ў гарадскім драмтэатры, на свяце горада Калеша ў Познаньскім ваяводстве і іншыя. Невыпадкова гэтыя калектывы, а яшчэ фальклорны гурт «Алена» і універсітэцкі ансамбль сучаснага танца сталі пераможцамі гарадскога агляду мастацкай самадзейнасці «Студэнцкая вясна-99» у пяці намінацыях з сямі.

Нашы калектывы-пераможцы прадэманстравалі добры мастацкі густ, высокае майстэрства, павагу да гледача, культуру, якая і павінна быць уласціва універсітэцкім калектывам, студэнтам універсітэта.

### ФІЗКУЛЬТУРНА-МАСАВАЯ РАБОТА

Цікава і ў вострай напружанай барацьбе праходзіла універсітэцкая студэнцкая спартакіяда па 10 відах спорту. Пераможцам стала дружная каманда юрыдычнага факультэта. Асабліва прыемна, што спаборніцтвы па лёгкай атлетыцы, лёгкаатлетычнаму кросу адрозніваліся ад мінулагодніх масавасцю, высокімі вынікамі. Напрыклад, у асеннім лёгкаатлетычным кросе (кастрычнік 1998 г.) прынялі ўдзел больш за 600 студэнтаў. Таксама масавым і захапляючым быў Дзень здароўя, які прайшоў у канцы мая 1999 г.

### СПАРТЫЎНАЯ РАБОТА

Па выніках Спартакіяды вну Рэспублікі Беларусь у 1999 г. каманда ГрДУ імя Янкі Купалы заняла 3-е месца, прапусціўшы наперад зборныя Акадэміі фізкультуры і спорту і Гомельскага дзяржаўнага універсітэта.

На сённяшні дзень у нацыянальных зборных Рэспублікі Беларусь па адзінаццаці відах спорту рыхтуюцца да Алімпіяды 35 студэнтаў універсітэта.

Удала выступалі студэнты універсітэта на чэмпіянатах і Кубках Еўропы ў складзе нацыянальных каманд рэспублікі. Аж 19 нашых студэнтаў сталі іх пераможцамі. З іх два - у лёгкай атлетыцы, трое - у барацьбе самба.

Універсітэцкая каманда па грэка-рымскай барацьбе (14 чалавек, галоўны трэнер Максімовіч В.А.), самастойна выйграла Кубак Еўропы.

У спаборніцтвах на Кубак свету па барацьбе дзю-до студэнт факультэта фізічнай культуры Канстанцін Сямёнаў заняў 7-е месца. На чэмпіянаце Еўропы па самба студэнтка таго ж факультэта Валянціна Разуменка ўжо ў гэтым годзе заваявала два першых месцы сярод юніорак і моладзі. Студэнты-фізкультурнікі Іван Ярашэвіч і Дзмітрый Новік на чэмпіянаце Еўропы 1999 г. па самба занялі 3-е і 5-е месцы адпаведна. На чэмпіянаце Еўропы 1999 г. па грэка-рымскай барацьбе Эдуард Аплевіч у выніку спаборніцтваў быў пятым, а Алег Міхаловіч - чацвёртым, толькі ўжо на маладзёжным чэмпіянаце Еўропы.

У складзе баскетбольнай каманды «Гродна-93» чэмпіёнамі рэспублікі 1999 г. сталі 6 студэнтаў універсітэта, а валейбольнай каманды «Камунальнік», якая таксама выйграла ў гэтым годзе нацыянальны чэмпіянат - 5 нашых студэнтаў.

Падсумоўваючы гэтыя прыемныя вынікі, трэба адзначыць, што ўжо ў першым паўгоддзі 1999 г. Дзяржаўны камітэт па фізічнай культуры і спорту Рэспублікі Беларусь заслужана прысвоіў званне "Майстр спорту" шасці студэнтам нашага універсітэта.

### НАВУКОВА-ПЕДАГАГІЧНЫ ПАТЭНЦЫЯЛ

Ва універсітэце на сённяшні дзень занята 585 штатных адзінак выкладчыкаў, у тым ліку акадэмік НАН Беларусі - 1, дактароў навук, прафесараў - 36, кандыдатаў навук - 241, дацэнтаў - 169.

Супрацоўнікаў з вучонымі ступенямі і званнямі 47% (БДУ - 61%, ГДУ - 49%, сярэдняе па міністэрству - 47%). Відавочна, што універсітэту ў гэтым кірунку трэба яшчэ значна працаваць. Аналіз у межах груп спецыяльнасцей паказвае, што найбольшыя намаганні трэба прыкласці ў падрыхтоўцы кадраў вышэйшай кваліфікацыі факультэтам фізічнай культуры, псіхалогіі і педагогікі, філалагічнаму факультэту. З другога боку, калі правесці аналіз падрыхтоўкі аспірантаў, то больш актыўна вядзецца падрыхтоўка аспірантаў на факультэтах гісторыі і культуры, юрыдычным. Даволі складанай для універсітэта з'яўляецца праблема пераемнасці кадраў. Аналіз узроставага складу выкладчыкаў паказвае, што найбольш востра гэта праблема стаіць для факультэтаў эканомікі і кіравання, біялогіі і экалогіі.

### КОНКУРСНАЯ І АТЭСТАЦЫЙНАЯ КАМІСІЯ

У 1998/99 навучальным годзе быў аб'яўлены конкурс на замяшчэнне 92 пасад прафесарска-выкладчыцкага складу, у тым ліку: 11 вакансій на пасаду загадчыка кафедры; 2 вакансіі на пасаду прафесара; 27 вакансій на пасаду дацэнта, 30 вакансій на пасаду старшага выкладчыка; 18 - выкладчыка і 4 - асістэнта.

Усе аб'яўленыя конкурсы, за выключэннем конкурса па вакантнай пасадзе загадчыка кафедры матэматыкі і методыкі выкладання матэматыкі ў пачатковай школе і пасады дацэнта кафедры эканамічнай тэорыі, адбыліся, і ўсе вакантныя пасады ў 1998/99 навучальным годзе былі замешчаны.

Актыўную ролю ў вызначэнні адпаведнасці прэтэндэнтаў на вакантную пасаду патрабаванням, прадугледжаным адпаведнымі пунктамі Палажэння, а таксама патрабаванням тарыфна-кваліфікацыйных характарыстык пасад спецыялістаў вышэйшых вучэбных устаноў, іграла атэстацыйная і конкурсная камісія Савета універсітэта (старшыня - І.П. Мартынаў). Усяго было праведзена 7 пасяджэнняў камісіі, на якіх прымаліся аргументаваныя заключэнні па кандыдатурах тых удзельнікаў конкурсу, хто прэтэндаваў на пасаду загадчыка кафедры і прафесара альбо прымаў удзел у конкурсе на замяшчэнне пасады з больш высокім статусам. Усяго на пасяджэннях камісіі было абмеркавана 10 кандыдатур прэтэндэнтаў на пасаду загадчыка кафедры; 2 кандыдатуры - на пасаду прафесара; 11-кандыдатур прэтэндэнтаў на пасаду дацэнта, выбіраемых з павышэннем пасадавага статуса (з пасады старшага выкладчыка).

У дзейнасці па прысваенні вучоных званняў Савет універсітэта кіраваўся Палажэннем аб прысуджэнні вучоных ступеняў і прысваенні вучоных званняў (Пастанаўленне СМ РБ ад 16.05.1997 № 499).

Усяго ў 1998/99 навучальным годзе было разгледжана 15 атэстацыйных спраў, у тым ліку - 13 на 21.05.1999 г. па прысваенні вучонага звання дацэнта, 2 - па прысваенні вучонага звання прафесара.

Станоўчыя рашэнні аб хадайніцтве перад ВАК РБ аб прысваенні вучонага звання былі прыняты Саветам па ўсіх кандыдатурах спашукальнікаў.

### САЦЫЯЛЬНАЯ РАБОТА

Работа па сацыяльнай абароне членаў калектыва ўключае: далейшае развіццё нарматыўнай базы і непасрэдную работу па сацыяльнай падтрымцы супрацоўнікаў і студэнтаў. У гэтым годзе намаганнямі рэктарата і прафкама распрацавана і зацверджана палажэнне аб матэрыяльным стымуляванні супрацоўнікаў універсітэта, якое ў першую чаргу накіравана на забеспячэнне сацыяльнай функцыі і ўжо ў другую чаргу - функцыі стымуляцыі якасці і колькасці працы супрацоўніка.

Працягвалася выкананне жыллёвай праграмы. Так, у 1998/99 навучальным годзе універсітэт (набыў) атрымаў 11 кватэр. Вядома, гэта не 1997/98 навучальны год (21 кватэра), але адміністрацыя і прафкам планамерна працуюць над вырашэннем праблемы жылля. На сённяшні дзень у чарзе на жыллё знаходзяцца 103 чалавекі, у тым ліку 67 выкладчыкаў і 36 супрацоўнікаў. У 1997/98 годзе - адпаведна 124, 80, 44.

На жаль, даволі цяжка вырашаецца праблема забеспячэння студэнтаў інтэрнатамі. Нягледзячы на намаганні адміністрацыі (месцы ў іншых інтэрнатах), колькасць студэнтаў, вымушаных жыць на прыватных кватэрах, не змяншаецца.

У цэлым даволі добра абстаяць справы з аздараўленнем супрацоўнікаў і іх дзяцей. У бягучым годзе выдзелены сродкі для аздараўлення 117 супрацоўнікаў універсітэта і членаў іх сем'яў, 127 чалавек атрымалі пуцёўкі ў ФАК. На гэтыя мерапрыемствы універсітэт выдаў больш за 800 млн. руб. Рэгулярна аказвалася матэрыяльная дапамога ветэранам універсітэта, у тэрмін выплочваліся заработная плата і стыпендыі.

Распрацоўваюцца праекты рэканструкцыі фізкультурна-аздараўленчага цэнтра «Пагараны» і стварэння універсітэцкай паліклінікі.

### РАБОТА САВЕТА

Што тычыцца работы Савета універсітэта, у 1998/99 годзе адбылося 10 планавых яго пасяджэнняў. Пры падрыхтоўцы пасяджэнняў працягвалася практыка папярэдняга азнаямлення членаў Савета з пакетамі дакументаў па абмяркоўваемых пытаннях.

У справаздачны перыяд значная ўвага надавалася рашэнню пытанняў, звязаных з арганізацыяй і рэарганізацыяй структурных падраздзяленняў універсітэта. У прыватнасці, Саветам прыняты рашэнні аб стварэнні Інстытута сацыяльна-гуманітарных навук, дзейнасць якога рэгламентуецца зацверджаным Саветам Палажэннем аб Інстытуце. Загадам рэктара быў зацверджаны склад Савета Інстытута, які дзейнічае на падставе Палажэння аб Савеце Інстытута сацыяльна-гуманітарных навук;

*(Заканчэнне на 6 стар.).*

# ЗДАБЫТКІ, ВЫНІКІ І ПЕРСПЕКТЫВЫ

## АБ ВЫНІКАХ ДЗЕЙНАСЦІ УНІВЕРСІТЭТА Ў 1998/99 НАВУЧАЛЬНЫМ ГОДЗЕ І ЗАДАЧАХ НА 1999/2000 ГОД

*(Заканч. Пач. на 5 стар.).*

аб стварэнні кафедры замежных моў у Інстытуце павышэння кваліфікацыі і перападрыхтоўкі кіруючых работнікаў і спецыялістаў пры Гродзенскім дзяржаўным універсітэце імя Янкі Купалы;

у рамках пытання «Аб стане і перспектывах развіцця філалагічнага факультэта» вырашалася пытанне аб стварэнні на факультэце новых кафедраў, лабараторый і кабінетаў у 1999/2000 навучальным годзе.

### УДАСКАНАЛЕННЕ ВУЧЭБНА-ВЫХАВАЎЧАГА ПРАЦЭСУ

Пытанні, звязаныя з арганізацыяй і ўдасканаленнем навучальна-выхаваўчага працэсу ва універсітэце, знаходзіліся ў цэнтры ўвагі Савета на працягу ўсяго навучальнага года. У плане арганізацыі навучальна-выхаваўчага працэсу і вызначэння зместу адукацыі Саветам зацвярджаліся рабочыя навучальныя планы факультэтаў па адпаведных спецыяльнасцях, навучальныя праграмы па дысцыплінах кафедраў, праграмы дзяржаўных экзаменаў. Саветам універсітэта таксама былі прыняты рашэнні аб накіраванні ў НМЦ шэрагу навучальных праграм для зацвярджэння ў якасці тыпавых, а таксама падручнікаў, падрыхтаваных выкладчыкамі універсітэта, для атрымання грыфа МА РБ. У гэтай сувязі Савет універсітэта разгледзеў пытанне аб плане выданняў навучальнай і навучальна-метадычнай літаратуры на 1999 год. Саветам універсітэта было зацверджана Палажэнне аб нармаванні навучальнай працы прафесарска-выкладчыцкага складу на 1999/2000 навучальны год.

У зоне ўвагі Савета знаходзіліся пытанні, звязаныя з арганізацыяй і зместам навучальнага працэсу ў магістратуры і аспірантуры універсітэта. У гэтай сувязі зацвярджэнне Саветам прайшлі навучальныя планы па спецыяльнасцях магістратуры і аспірантуры, вырашаліся пытанні, звязаныя з адкрыццём новых спецыяльнасцей магістратуры.

У плане ўдасканалення зместу адукацыі Савет універсітэта разгледзеў пытанне «Аб шляхах інтэнсіфікацыі навучальна-выхаваўчага працэсу ва універсітэце», па якім прарэктарам па навучальнай працы Л.В.Рычковай быў зроблены даклад, дзе прадстаўлены стратэгічныя напрамкі аптымізацыі дадзенага аспекту дзейнасці універсітэта і вызначаны канкрэтныя меры па павышэнні яе эфектыўнасці. У прыватнасці, прыняты шэраг праграм, у тым ліку: Праграма ўкаранення інфармацыйных тэхналогій да 2000 года, праграма па ўдасканаленні прымянення тэхнічных сродкаў навучання, а таксама рэкамендацыі па арганізацыі самастойнай працы студэнтаў.

Значная ўвага надавалася пытанню падрыхтоўкі выпускнікоў універсітэта па педагагічнай дзейнасці. У змесце даклада па дадзеным пытанні (дакладчык - старшыня пастаяннай камісіі Савета па пытаннях навучальнага працэсу М.В. Жарскі) быў прадстаўлены аналіз розных аспектаў падрыхтаванасці студэнтаў да прафесійна-педагагічнай дзейнасці, вызначаны тыя моманты, якія патрабуюць больш пільнай прапрацоўкі (у прыватнасці, арганізацыя кіраўніцтва педагагічнай практыкай, павелічэнне колькасці гадзін на псіхолага-педагагічную і метадычную падрыхтоўку будучых настаўнікаў і г.д.). Асноўныя падыходы, рэалізацыя якіх неабходна ў плане павышэння ўзроўню прафесійнай кампетэнтнасці будучых педагогаў, знайшлі адбітак у прынятым Саветам пастанаўленні.

Трэба адзначыць сістэмнасць, якая мае месца ў падыходзе да вырашэння пытанняў, што тычацца якасці падрыхтоўкі спецыялістаў у ГрДУ. Яна адлюстравана ў «адсочванні» дадзеных пытанняў на ўсіх этапах навучальнага працэсу. Так, у прыватнасці, традыцыйным для Савета з'яўляецца пытанне аб выніках уступных экзаменаў ва універсітэт, якое ў 1998/99 навучальным годзе было таксама разгледжана і па выніках яго абмеркавання былі распрацаваны меры па далейшым удасканаленні структуры і форм, правядзення ўступных экзаменаў, падрыхтоўчай працы прыёмнай камісіі і г.д. Не менш значным з'яўляецца пытанне аб выніках працы Дзяржаўнай экзаменацыйнай камісіі, аналіз дзейнасці якой і выпрацоўка рэкамендацый у плане яе ўдасканалення і прывядзенне ў адпаведнасць з нарматыўнымі дакументамі новага пакалення быў здзейснены навучальна-метадычным аддзелам.

З пазіцый адзначанай вышэй сістэмнасці важна адзначыць, што ў полі зроку Савета знаходзіліся пытанні, якія датычаць актуальнай дзейнасці створанага пры ГрДУ Інстытута павышэння кваліфікацыі і перападрыхтоўкі кіруючых работнікаў і спецыялістаў, а таксама перспектыўных напрамкаў яго развіцця, якія павінны знайсці адлюстраванне ў Комплекснай праграме павышэння кваліфікацыі і перападрыхтоўкі кіруючых работнікаў і спецыялістаў прадпрыемстваў і ўстаноў рэгіёну на 1999-2000 гады, у адкрыцці новых напрамкаў і спецыяльнасцей перападрыхтоўкі і г.д.

Важнае значэнне надавалася пытанням, звязаным не толькі з арганізацыяй, зместам і сістэмнасцю адукацыі, але і яго метадалагічным абгрунтаваннем. У гэтай сувязі Саветам была разгледжана і зацверджана Праграма гуманізацыі і гуманітарызацыі адукацыі да 2001 года.

### НАВУКОВА-ДАСЛЕДЧАЯ РАБОТА

Навукова-даследчая работа - адзін з прыярытэтных напрамкаў дзейнасці універсітэта, што абумовіла пільную ўвагу Савета да вызначаных яе аспектаў.

На пасяджэнні Савета былі разгледжаны вынікі навукова-даследчай працы універсітэта за 1998 год. З дакладам па даным пытанні выступіў прарэктар на навуковай рабоце В.В. Сянько. У дакладзе была прадстаўлена таксама Канцэпцыя развіцця навукі ва універсітэце да 2005 года, падведзены вынікі конкурса сярод супрацоўнікаў і кафедр у галіне навуковых даследаванняў па прыродазнаўчых і гуманітарных навуках за 1998 год, які ўпершыню праводзіўся ва універсітэце ў 1998 годзе. Крытэрыі ацэнкі навуковай дзейнасці калектыва кафедры і асобных канкурсантаў былі зацверджаны рашэннем Савета .

З мэтай забеспячэння ўмоў для завяршэння працы над доктарскімі дысертацыямі Саветам было зацверджана Палажэнне аб парадку і ўмовах вылучэння грантаў.

Рашэннем Савета быў зацверджаны план навукова-даследчай працы універсітэта на 1999 год.

На пасяджэннях Савета былі разгледжаны: прадстаўленыя да зацвярджэння тэмы кандыдацкіх дысертацый аспірантаў і спашукальнікаў розных спецыяльнасцей; пытанні, звязаныя з дазволам на кіраўніцтва аспірантамі і спашукальнікамі, рэкамендацыяй да ўдзелу ў конкурсах рознага ўзроўню навуковых праектаў супрацоўнікаў універсітэта; зацвярджэннем навукова-даследчых справаздач па тэмах.

### ДЗЕЙНАСЦЬ САВЕТА ПА САЦЫЯЛЬНЫХ ПЫТАННЯХ

У ліку пытанняў, якія абмяркоўваліся на пасяджэннях Савета, былі пытанні, звязаныя з сацыяльнай падтрымкай супрацоўнікаў і студэнтаў універсітэта. Цэнтральным у гэтым шэрагу з'явілася пытанне «Аб праграме сацыяльнай падтрымкі супрацоўнікаў і студэнтаў універсітэта». У рамках данага пытання была абмеркавана і прынята Праграма сацыяльнай падтрымкі супрацоўнікаў і студэнтаў у ГрДУ.

Не менш важна адзначыць, што Савет зацвердзіў і Праграму развіцця фізічнай культуры і спорту ў ГрДУ, мэтавае прызначэнне якой заключаецца ў павышэнні ўзроўню стану здароўя прафесарска-выкладчыцкага складу, супрацоўнікаў, аспірантаў, магістрантаў і студэнтаў, а таксама ў стварэнні ўмоў для развіцця і павышэння эфектыўнасці сістэмы фізічнага выхавання студэнтаў універсітэта і г.д. Савет таксама разгледзеў пытанне аб стварэнні базы аздараўлення для выкладчыкаў і студэнтаў універсітэта.

Апрача таго, на шэрагу пасяджэнняў вырашаліся пытанні аказання матэрыяльнай дапамогі ветэранам вайны і працы (непрацуючым пенсіянерам); размеркаванне імянных стыпендый студэнтам, выдзяленне сродкаў для аказання дапамогі ў сувязі з Міжнародным днём інвалідаў; для набыцця пуцёвак для супрацоўнікаў і г.д.

Паводле азначаных вышэй асноўных напрамкаў дзейнасці ў рамках кампетэнцыі Савета разглядаліся пытанні, прадугледжаныя Палажэннем аб Савеце вну і Статутам Гродзенскага дзяржаўнага універсітэта імя Янкі Купалы, у тым ліку:

- пытанні, звязаныя з выкананнем бюджэта і фінансаваннем розных напрамкаў гаспадарчай дзейнасці;
- пытанне аб дзейнасці універсітэта па фарміраванні пазабюджэтных даходаў і маркетынгавай праграмы і інш.;
- пытанне аб кошце навучання ў Гродзенскім дзяржаўным універсітэце імя Янкі Купалы ў 1999/2000 навучальным годзе.

Трэба адзначыць, што вялікую ролю ў падрыхтоўцы пытанняў, якія выносіліся на абмеркаванне і праектаў пастаноў па іх адыгрывалі пастаянныя камісіі Савета, а таксама адпаведна зместу пытання -аддзелы навучальны, навучальна-метадычны, НДС.

У цэлым аналіз дзейнасці Савета універсітэта за мінулы навучальны год сведчыць: яе асноўныя стратэгічныя напрамкі атрымалі сваё змястоўнае напаўненне ў працэсе абмерквання і прыняцця рашэнняў па іх, што стварае ўмовы для аптымізацыі актуальнай дзейнасці універсітэта, а таксама спрыяе рэалізацыі стратэгіі яго перспектыўнага развіцця як навуковага, адукацыйнага і культурнага цэнтра рэгіёна.

# СПОРТИВНЫЙ КАЛЕЙДОСКОП

**РУБРИКУ ВЕДЕТ СТАРШИЙ ПРЕПОДАВАТЕЛЬ КАФЕДРЫ ФИЗВОСПИТАНИЯ О. СМОЛЯКОВ**

## «ЗОЛОТО» И «СЕРЕБРО»

На первенстве мира среди юниорок по борьбе самбо наши спортсменки показали высокие результаты. Валентина Разуменко, студентка 2 курса факультета физической культуры, завоевала две золотые медали, а у Антонины Куровской, студентки 1 курса того же факультета, две серебряных. Готовил этих спортсменок доцент кафедры спортивной медицины и ЛФК А.Р. Бардин. На первенстве Республики Беларусь по борьбе дзю-до первое место и золотую медаль завоевал студент 3 курса факультета физической культуры Вадим Уколов, (тренер И.Э. Шарко.)

15-18 октября в Бресте прошли VII Республиканские юношеские игры по стрельбе из лука. Студентка 1 курса факультета физической культуры Елена Астафьева заняла там первое место (золотая медаль).

**А. ЕМЕЛЬЯНЕНКО, председатель спортклуба.**

## НА СМОТРЕ – ФУТБОЛИСТЫ

Завершилось первенство университета по мини-футболу в программе круглогодичной спартакиады вуза. Две недели шли упорные поединки восьми команд факультетов.

Лучше всех оказалась команда факультета экономики и управления (декан Ю. Э. Белых, зам. декана по спорту Т. И. Малышко).

Будущие экономисты уступили только биологам - 0 : 1. Последовательно победили команды: филологов - 9:0, гуманитарного - 8:1, физиков - 8:0, математиков - 13:2, историков - 9:1, юристов - 3:2 и стали чемпионами университета.

Вот кто привел команду к победе: Ю.Бойко, А. Шушко, В. Севастьяник, Д. Ровнейко, Э. Обухович, П. Шапель, А. Карпицкий, В. Алтышкин, А. Довыденко.

Второе место завоевали биологи (декан Г. Е. Минюк, зам. декана по спорту Л.А.Пахай). Третье место завоевали математики (декан В. К. Бойко, зам. декана по спорту И. Н. Боярчук). Им уступили команды исторического факультета, юрфака, физико-технического факультета, гуманитарного и филологического факультетов. Команды-чемпионы и призеры соревнований награждены дипломами соответствующих степеней спортклуба и призами.

Уверенно провел соревнования главный судья, старший преподаватель кафедры физвоспитания Н.И.Ожогин.

## НА ТРАССЕ ЗДОРОВЬЯ

Солнечным выдался осенний день, когда проходил легкоатлетический кросс университета. 140 девушек и 163 юноши из сборных команд восьми факультетов боролись за командную победу и за призы личного первенства на дистанциях 500 и 1000 метров. Торжественно прошел ритуал открытия соревнований. Участников приветствовали, пожелав высоких результатов, заведующий отделом по воспитательной работе Г. Кобяк, профессор В.Тарантей, директор спортклуба А.Емельяненко.

Затем начались забеги. Почетное право дать старт первому забегу было предоставлено декану факультета физической культуры А. Навойчику. Лучший результат у девушек показала студентка факультета психологии и педагогики Елена Пушко. 1 минута и 26,4 секунды - ее победное время. На второй ступени пьедестала почета стояла ее подруга по команде Светлана Демиденко - 1,29,3 секунды, третье время - у Татьяны Поведайко - 1,30 сек. У юношей лучше всех прошел километровую дистанцию Илья Анисимов (факультет экономики и управления) - 2 минуты 44,3 секунды, второе место - у будущего филолога Юрия Юшкевича - 2.45,2 сек., третье - у Виктора Залецкого (факультет психологии и педагогики) - 2.53,3 сек.

В командном зачете уверенную победу ( в зачет шло двадцать лучших результатов) одержали студенты факультета экономики и управления - 528,5 очков (декан Ю.Э.Белых, зам.декана по спорту Т. И. Малышко), второе место у команды факультета психологии и педагогики - 652 очка (декан В. П. Тарантей, зам. декана по спорту В. В. Мышкевич), третье место у будущих юристов - 683 очка (декан И.И.Веленто, зам. декана по спорту А. А. Кудель).

Далее места распределились в следующем порядке: филологический факультет - 742 очка, математический факультет - 807 очков, факультет истории и культуры - 925,5 очков, физико-технический факультет - 1316,5 очка, факультет биологии и экологии - 2092 очка.

Четко работала судейская коллегия, которую возглавлял главный судья, старший преподаватель кафедры физвоспитания, мастер спорта, судья национальной категории В.А. Чекель.

## В ПРОГРАММЕ СПАРТАКИАДЫ

Завершая летний легкоатлетический сезон, городское управление по физической культуре и туризму провело кросс в программе городской спартакиады.

Университет был представлен двумя командами: факультета физической культуры и сборной университета.

Уверенную победу одержала команда факультета, второе место - у команды училища олимпийского резерва, на третьем месте - команда университета.



## НАВУКОВА-ПРАКТЫЧНАЯ КАНФЕРЭНЦЫЯ

**14 КАСТРЫЧНІКА НА БАЗЕ ФАКУЛЬТЭТА ГІСТОРЫІ І КУЛЬТУРЫ ПРАЙШЛА МІЖВУЗАЎСКАЯ СТУДЭНЦКАЯ НАВУКОВА-ПРАКТЫЧНАЯ КАНФЕРЭНЦЫЯ ПА ТЭМЕ «УЗ'ЯДНАННЕ ЗАХОДНЯЙ БЕЛАРУСІ З БССР: ГІСТОРЫЯ І СУЧАСНАСЦЬ».**

У актавай зале факультэта ўдзельнікі канферэнцыі падчас адкрыцця яе работы заслухалі выступленні прарэктара па навуковай рабоце, дацэнта В.В.Сянько, дэкана факультэта гісторыі і культур прафесара І.П.Крэня.

Затым пачалося пленарнае пасяджэнне, дзе выступілі кандыдат гістарычных навук, дацэнт кафедры гісторыі Беларусі І.І. Коўкель, дэпутат народнага Сходу Заходняй Беларусі ў Беластоку, ганаровы грамадзянін г. Брэста В.П. Ласковіч, кандыдат гістарычных навук, выкладчык кафедры гісторыі Беларусі В.А. Белазаровіч, студэнтка 1 курса завочнага аддзялення факультэта гісторыі і культуры А.У. Жыгала.

У выступленнях на пленарным пасяджэнні прагучалі цікавыя даследчыя думкі. З вялікай увагай прысутныя слухалі выступленні, аздобленыя гістарычнымі фактамі, лічбамі, прозвішчамі людзей.

Пасля пленарнага пасяджэння пачалася работа па секцыях, затым, на заключным пасяджэнні, кіраўнікі секцый выступілі са справаздачамі і падвялі вынікі канферэнцыі.



# НАДНЁМАНСКІЯ ГАЛАСЫ

**Марына КАНДРАТОВІЧ,**
**студэнтка 2 курса**
**філалагічнага факультэта**

### *ЯМУ*

Гады яго ляглі на твары,
Ды і кранулі валасы.
Тады чаму мае ўсе мары
Вакол яго былой красы,
Што свеціцца на скронях
слёзна,
Ляжыць папрокам на губах?
Але ўцякаці будзе позна:
Каханне свеціцца ў вачах.

***

Сёння зззяе зорка надзеі,
Заўтра згасне, зальецца
слязой.
Мары светлыя і ідэі
Скрые змрок і пакрые імглой.
Мае шчасце ў сябра
прытулак.
Вера з торбаю цягнецца ў
свет.
Я шукаю ў сваце прытулак.
І шукаю дабро, яго след.

***

Ты - мой лёс. Мая бяда.
Смутак мой. Крыніца зла.
Гнеў на ўсіх. Ручай слязін.
Бо начуеш не адзін.
Спрэчка днём, а ночку - жах,
Што пакінеш, шэпча страх,
Не пакінеш - гонар мой.
Сэрца кажа: - Ён не твой.
Хто для зла і любіць шык,
Ён кахае толькі тых.

**Ольга ПОЧИНЧИК,**
**студентка 2 курса**
**математического факультета**

### *МОЯ ГИТАРА*

Добро пожаловать домой,
Ты так давно здесь не была.
И ветра свист, и шум дождя
Ты за окном не слышала.
Добро пожаловать домой,
Где тишина, в ночи покой,
Где ярких красок свет горит,
Где одиночество не спит.
Добро пожаловать домой,
Ко мне на руки, мой малыш.
Я прикоснусь к тебе рукой,
И ты таинственно звучишь.
Веселых звуков нежный бриз:
Моя гитара - мой каприз.



***ЗАКАТ НАД ОЗЕРОМ.*** *Фотоэтюд.*

# АСТРОПРОГНОЗ НА НОЯБРЬ

**ОВНЫ.** Счастливую пору любви для многих представителей этого знака сменит монотонная работа, забота о дне завтрашнем. А вместе с этим появятся проблемы, связанные со здоровьем. Звезды предупреждают: будьте умеренны во всем и тогда удастся избежать срыва.

**ТЕЛЬЦЫ.** Прислушиваясь к советам астролога, Вы достигнете большего в работе, в любви, на финансовой ниве. С самого начала месяца Вы будете на коне: на службе, в учебе все будет идти как нельзя лучше. А вот для сердечных разговоров лучше подойдет последняя декада. В сфере чувств - полная гармония, если проявите такт, терпение. Финансы, увы, не порадуют Тельцов.

**БЛИЗНЕЦЫ.** Корректируйте свои поступки и намерения: первая половина месяца не сулит успеха в общении с людьми, да и на работе. Порадуют близкие люди. С ними Близнецы найдут контакт и взаимопонимание. Вторая половина месяца будет удачной для тех Близнецов, которые заняты в сфере финансов.

**РАКИ.** Пора ожидания, даже некоторого оцепенения. Не хочется ничего предпринимать, ни о чем не мечтается. Это пройдет, как только минует спячка и появится конкретное деловое предложение. А оно несомненно появится. И скоро. Берегите здоровье, занимайтесь спортом. Ваше время придет. А пока - затишье: в работе, творчестве, любви, финансах. Во всем.

**ЛЬВЫ.** Чем информированнее Вы окажетесь, чем легче будете на подъем, тем успешнее будут Вас невольно провоцировать на неразумные траты. На службе - успех. В семье - покой. В финансах, к сожалению, провал.

**ДЕВЫ.** Планетные конфигурации месяца не обещают стабильности настроения. Но здоровье и состояние в целом улучшатся. Проблемы, которые шли чередой, наконец, оставят Вас в покое. Рекомендуем не рисковать, поберечь здоровье. К работе следует относиться как к развлечению. Небесная правительница одарила Вас аккуратностью и талантом. Эти качества помогут Вам в трудную минуту.

**ВЕСЫ.** Лень и несвоевременные мечты сбивают многих представителей этого знака с панталыку. Не стоит рисовать в конспекте цветочки во время лекции по математике. Из-за этого Вы будете не в состоянии справиться с ситуацией. В любви неизбежна драматическая развязка, потому что Вы делаете ошибки одну за другой. Разберитесь в своих чувствах.

**СКОРПИОНЫ.** Ваш месяц. Более благоприятная обстановка дома. Появятся коекакие деньги. Научитесь тратить разумно. В любви - крах. Отвернется Ваша половина надолго, если не навсегда, и никакие усилия с Вашей стороны не помогут. Положитесь на время. оно все расставит по местам.

**СТРЕЛЬЦЫ.** Представители этого знака любят путешествовать. Невозможность заниматься любимым делом повергнет Стрельцов в меланхолию. Из этого состояния выведут заботы о ближних, которые пойдут нескончаемой чередой. Те, у кого есть работа, получат повышение по службе. У кого ее нет - получат интересное предложение.

**КОЗЕРОГИ.** Вы ощутите прилив сил и бодрости благодаря энергии Марса. Меркурий придаст Вам красноречия и убедительности в первой декаде. В такое время хорошо сдавать экзамены. Затем последуют дни апатии и сонливости, но ненадолго. Приятный вечерок в хорошей компании поставит все на места, и вы будете в форме, в настроении и в фаворе.

**ВОДОЛЕИ.** Трудно приспособиться к новым условиям, но придется, потому что новые правила лучше старых. Если Вы сумеете изменить свою жизнь, у Вас все пойдет по-другому: появятся деньги, друзья, придет успех.

**РЫБЫ.** Трудный месяц для всех представителей этого знака. Придется пересмотреть свою прежнюю жизнь, чтобы адаптироваться в тех условиях, которые предлагает фортуна. Важно знать, что трудности - временные. Впереди - перемены к лучшему.

*Рэдактар* **Людміла Мікалаеўна ДАНІЛАВА**

*Заснавальнік: Гродзенскі дзяржаўны ўніверсітэт імя Янкі Купалы.*
Рэгістрацыйнае пасведчанне № 519.

Газета набрана, звярстана і надрукавана на тэхніцы выдавецкага аддзела Гродзенскага дзяржаўнага універсітэта імя Янкі Купалы. ЛП № 111 ад 29.12.97 г.
Вул. Ажэшкі, 22, 230023, г. Гродна.

*Набор і вёрстка:* **М. ВЕРСТАК, Д. КЛАПАТОК.**
*Фота:* **Ул.САРОКІН.**
*Карэктура:* **Н. ДУДКО.**

*Здадзена ў набор 20.10.99.*
*Падпісана да друку: 29.10.99. 15.00*
*Заказ № 123*

Аб'ём - 1 ум. друк. арк.
Наклад 500 асобнікаў.

Аўтары надрукаваных матэрыялаў адказваюць за падбор і дакладнасць прыведзеных фактаў, цытатаў, эканамічных даных, асабістых імёнаў, геаграфічных назваў і іншай інфармацыі, а таксама за тое, каб у матэрыялах не ўтрымлівалася даных, якія не падлягаюць адкрытай публікацыі. Рэдакцыя можа друкаваць артыкулы ў парадку абмеркавання, не падзяляючы пункту гледжання аўтара.

*Наш адрас:* 230023, г.Гродна, вул. Ажэшкі, 22, пакой 228. ☎ 72-08-17.